прэзентацыі

# Культурны брэнд

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася прэзентацыя двух новых выданняў — фундаментальнага даследавання «Беларускі Буквар» і ілюстраванай кнігі для моладзі «Вынаходства Буквара ў Беларусі». Унікальны феномен айчыннай і сусветнай гісторыі, свайго роду культурны брэнд нашай краіны — Буквар — даследаваў выбітны кнігазнавец і культуролаг, намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алесь Суша. Навуковец займаецца гэтым пытаннем на працягу па меншай меры дзесяці гадоў.

*Фота з сайта nlb.by*



*Падчас прэзентацыі.*

У 2012 годзе Алесь Суша паспрыяў перавыданню найбольш старажытнага Буквара з тых, што захоўваюцца на тэрыторыі Беларусі, у 2016—2018 гг. менавіта намаганнямі даследчыка з забыцця быў вернуты самы першы ў свеце Буквар, адзіны экзэмпляр якога — у Лондане. Новае буйнафарматнае выданне прапануе падрабязны рэтраспектыўны агляд гісторыі падручніка для навучання грамаце: ад зараджэння пісьменства ў Беларусі і да нашых дзён. Багата ілюстраваная кніга стала вынікам дэталёвага аналізу тысяч архіўных і апублікаваных крыніц.

**Мікіта ШЧАРБАКОЎ**